# Шчырасцю заваражыць, матчынаю мовай...

**Надзея ПАРЧУК**



## *Прыходзіш сваімі радкамі*

*У вянок Яўгеніі Янішчыц*

Шкада, што цябе ўжо
няма сярод нас,
Ды ў думках і сэрцах ёсць нашых.
Твой дзесьці ў самоце
пасецца Пегас,
Сілкуецца роснаю пашай.

Бывае, пад неба ўзвіваецца ён
На крылах любові і жалю
І, бы непрыкаяны белы анёл,
За воблачнай носіцца даллю.

Гукае, шукае ўладарку сваю,
Ды так і нідзе не знаходзіць,
І ціха спускаецца зноў на зямлю,
Да вёсачкі Рудкі падходзіць…

Шкада, што цябе ўжо няма сярод нас,
Ды ў думках і сэрцах ты з намі.
Хай лета ці восень, вясна ці зіма –
Прыходзіш сваімі радкамі.

## *Мой свеце ясны*

Зара ўзышла і расцвіла
Ружовай кветкаю над гаем.
І рунь у полі ажыла,
Нябёсы росамі вітае.

Мой свеце ясны, дарагі,
Звіні і лісця над зямлёю,
Каб не было нідзе тугі,
Каб мы натхняліся табою.

* * *

Каб рэкі паілі нас чыстай вадой,
А ў полі калоссе шумела –
Не цешмася, людзі, чужою бядой,
Каб наша, крый Бог, не прыспела.

Каб лад быў у хатах, а ў душах – святло,
І радасць штодзённа вітала –
Давайце маліцца за тое сяло,
Дзе нас коліс маці люляла.

Павінна хоць штосьці застацца святым
У нашых зняверадных сэрцах,
Бо толькі жывём мы,
пакуль даражым
Радзімай, рачулкай, азерцам…

Каб шчасце людское нязгасна цвіло
На нашых жыццёвых сцяжынах,
Адорвайма іншых сардэчным цяплом –
Найшчодра,
Нястомна,
Няспынна!

## *Дакрануцца словам*

Мне б да кожнае душы
Дакрануцца словам,
Шчырасцю заваражыць,
Матчынаю мовай,

Цеплынёю атуліць
І надзеяй светлай,
Дабрынёю адарыць,
Рыфмай запаветнай.

Мне б адметных слоў знайсці
На сваёй палітры,
Да людзей з імі прыйсці,
Як святар з малітвай.

## *Малітва*

Гасподзь, блаславі гэты век,
Хай наша жыццё прадаўжаецца:
Чым болей жыве чалавек,
Тым больш дабрынёй напаўняецца.

І мудрасць прыходзіць да нас
З гадамі, як скроні заснежацца,
Бы яблык, асвечаны ў Спас,
Зарою ў далоні засвеціцца.

## *Вечныя агні*

Гараць кахання вечныя агні.
Іх не патушыць лівень альбо вецер.
Паўсюль, куды навокал ні зірні,
Яны зіхцяць, нязгасныя, па свеце...

Іх гэтак многа ясных паміж нас,
Нібыта зор у высях асвячоных,
Бы каласоў у полі ў жніўны час
Прамністым сонцам
шчодра залачоных.

Пакуль Зямля плыве паміж планет –
Не перастане,
будзе жыць каханне.
З любоўю мудры Бог стварaў Сусвет,
З любоўю жыць –
паслаў нам завяшчанне.